7. Кириченко, К.В. Методи роботи укладачів леґендарної частини літописів Великого Князівства Литовського: на прикладі запозичень із тексту Іпатіївського літопису // Український історичний журнал. – 2014. – № 2. – С. 177–203.

8. Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / В.Ю. Ластоўскі. – Вільня: Друкарня Марціна Кухты, 1910. – IV+104 с.

9. Любавский, М.К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства. – Москва: Университетск. типогр., 1892. – VIII+884+C+VI с.

10. Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. – 2-е изд. – Москва: Московск. худож. печатня, 1915. – [IV]+401+III с.

11. Полное собрание русских летописей. – Т. 2: Ипатьевская летопись / Гл. ред. Я.И. Бередников. – [1-е изд.] – Санкт-Петербург: Типогр. Э. Праца, 1843. – IX+381 с.

12. Полное собрание русских летописей. – Т. 2: Ипатьевская летопись / Подг. к изд. А.А. Шахматов. – 2-е изд. – Санкт-Петербург: Типогр. М.А. Александрова, 1908. – XVI+938+ 87+IV с.

13. Полное собрание русских летописей. Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца; Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / Подг. к изд. Н.Н. Улащик и В.А. Чемерицкий. – Москва: Наука, 1975. – 234 с.

14. Полное собрание русских летописей. Т. 35: Летописи белорусско-литовские / Подг. к изд. Н.Н. Улащик и В.А. Чемерицкий. – Москва: Наука, 1980. – 307 с.

15. Полное собрание русских летописей. Т. 40: Густынская летопись / Подг. к изд. Ю.В. Анхимюк, С.В. Завадская, О.В. Новохатко и А.И. Плигузов. – Санкт-Петербург: «Дмитрий Буланин», 2003. – 202 с.

16. Пресняков, А.Е. Лекции по русской истории. Т. 2. Вып. 1: Западная Русь и Литовско-Русское государство. – Москва: Гос. соц.-эк. изд-во, 1939. – 247 с.

17. Русина, О. В. Україна під татарами і Литвою. – Київ: “Альтернативи”, 1998. – 320 с.

18. Gwagnin, A. Kronika Sarmacji Europskiej. – Kraków: Drukarnia Mikołaja Loba, 1611. – Księga 2: Kronika W. X. Litewskiego. – S. 1–120.

19. Ochmański, J. Nad Kroniką Bychowca // Studia Źródłoznawcze. – T. 12. – 1967. – S. 155–163.

20. Pociecha, W. Królowa Bona (1494 – 1557): czasy i ludzie Odrodzenia. T. 2. – Poznań: Poznańskie Towarzystwo Przyjaciół Nauk, 1949. – 598 s.

21. Stryjkowski, M. Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i wszystkiej Rusi. T. 1. – Warszawa: Nakład G.L. Glücksberga, 1846. – XLVIII+63+392 s.

22. Wijuk Kojałowicz, A. Historiae Litvanae pars prior, de rebus Litvanorum ante susceptam Christianam religionem conjunctionemque Magni Litvaniae Ducatus cum Regno Poloniae. – Dantisci: Sumptibus Georgii Försteri, 1650. – [12]+399 p.

## ДЫНАСТЫЯ СВЯТЫХ: ПРАЕКТЫ СТВАРЭННЯ КУЛЬТУ СВЯТОГА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У XIII – XVI СТ.

**А. Ул. Любы**

Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, liuby@list.ru

Аўтар раскрывае, чаму не ўдалося рэалізаваць праект кананізацыі Казіміра і паказаць перавагу «дынастыі святых» над супернікамі як на праваслаўным усходзе, так і пратэстанцкай поўначы. З аднаго боку Казімір быў патронам царквы ў Рэчы Паспалітай, існавала народная

традыцыя святак і мастацкага ўвасаблення ў іканаграфіі. Але працэс ўрэшце рэшт трансфармаваўся ў царкоўнае паданне і народнае хрысціянства. Палітычны змест быў страчаны.

*Ключавыя словы*: кароль Казімір; дынастыя святых; Рэч Паспалітая.

The author reveals why the project of canonization of Casimir failed to be implemented and to show the superiority of the *dynasty of saints* over the opponents both in the Orthodox East and the Protestant North. On the one hand, Kazimir was the patron of the church in the Polish-Lithuanian Commonwealth, there was a folk tradition of Yuletide and artistic embodiment in iconography. But the process eventually transformed into church tradition and popular Christianity. The political content was lost.

*Keywords*: king Kazimir; dynasty of saints; Polish-Lithuanian Commonwealth.

Пад «дынастыяй святых» разумеем працэс стварэння дынастычнага наратыва, цэнтральным элементам з’яўляецца асоба праведніка-родзіча, якому прызначана роля выратавальніка родных і Радзімы (абавязковы дзяржаўніцкі кампанент). Выключным матывам для кананічнай магчымасці стварэння падобных дынастый святых з’яўляецца частка хрысціянскай літургіі верных, дзе заклікаецца падчас прычасця да “супольнасці святых” (падкрэсліваючы вертыкальныя і гарызантальныя аднамомантныя сувязі ва Усяленскай Царкве падчас таінстваў).

Праваслаўная царква па меры прасоўвання ў язычніцкі дзяржаўніцкі свет Паўднёвай і Усходняй Еўропы надавала фарміраванню “нацыянальных” дынастый святых вялікую ўвагу. Тут можна ўзгадаць, што для Усходняй Еўропы ў другой палове XI ст. канструіруецца культ святых “страстотерпцев” князёў з дынастыі Рурыкавічаў – Барыса і Глеба [11, Ч. IV; 12; 3, с. 294, etc.]. Аднак больш відавочная ідэалагічная сакралізацыя дынастыі адбываецца праз стварэнне культу “роўнаапостальных” манархаў Уладзіміра [12] і Вольгі [10; 14] (працэс афармлення расцягнуўся да сярэдзіны XIII ст.).

Акрамя “старажытнарускага”, у прасторы візантыйскага хрысціянства, ствараюцца царкоўна-дзяржаўныя наратывы для Балканаў: Першага Баўгарскага царства (цар Пётр, культ якога пачынае складацца ўжо ў канцы X ст.), Сербскага каралеўства (святы Сава і дынастыя Няманічаў; афармляецца ў другой палове 1230-х – пачатку 1260-х гг.) [9, с. 311, etc.; 15, с. 135, etc.].

У Каталіцкай царкве Цэнтральнай Еўропы ў сувязі з хрысціянізацыяй балцкіх земляў у канцы X – першым дзесяцігоддзі XI ст. фарміруецца культ святога Войцеха-Адальберта. Біскуп Пражскі, манах-прапаведнік бенедыктынскага ордэна – ён злучае ў сабе дынастычную прастору ад Велькапольшчы да Чэхіі. Адразу пасля сваёй смерці быў ушанаваны сучаснікамі-манархамі – цырымонія адбылася ў 1000 г. у Гнезна з прыездам імператара Атона III і польскага, а ў будучым, і чэскага караля Баляслава Храбрага [25, с. 183, etc.]. Агіяграфічная традыцыя складаецца ў першае дзесяцігодзе XI ст. і аўтарства некаторых спісаў належыць святому Бруну з Кверфурта, прапаведніку лацінскага хрысціянства ва Усходняй Еўропе (напаткаў смерць у 1009 г.) [25, с. 159–168]. Мошчы святога Войцэха звяртаюць на сябе ўвагу на працягу XI і XII ст., як патрэбныя элементы палітычнай гісторыі Цэнтральнай Еўропы [22, с. 189, etc.; 23].

Такім чынам, утварэнне буйных дзяржаўных структур і хрысціянізацыя вялікіх язычніцкіх рэгіёнаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы патрабавала выпрацоўкі мадэлі легітымнасці дынастый, звязаных са святасцю занавальніка царкоўнай структуры ў дзяржаве і яе “сімфоніі” ў правядзенні хрысціянізацыі. І

хаця працэс асвячэння ва ўсходняй і ў заходняй цэрквах адрозніваўся, аднак мабілізоўваў адныя і тыя ж ідэалагічныя рэсурсы.

У другой палове XII – XIII ст. сістэма дэцэнтралізацыі дзяржаўных утварэнняў Усходняй Еўропы запатрабавала карэктыроўкі палітычнай культуры. Святасць прадстаўнікоў дынастыі ссоўваецца з першай персоны ў кіруючым родзе (заснавальніка царквы ў дзяржаве) на другасную (той, хто "не хоча" быць кіраўніком-князем, але выконвае ратавальную ролю для дзяржавы). Так святымі для праслаўлення асобных княстваў становяцца мясцовыя князі: Канстанцін Яраславіч Мурамскі (пачатак XIII ст.), Міхаіл Усеваладавіч Чарнігаўскі (звесткі аб далучэнні да ліку святых – XVI ст.), Мсціслаў Уладзіміравіч Манамашыч для Ноўгарада, Еўфрасіня княжна Полацкая, і інш. [14]. Фактычна на змену імперскай парадыгме "ойкумены" прыходзіць разуменне "лакальнай" парадыгмы памесных цэркваў і нават яе частак, моцна звязаных з нараджэннем новых дзяржаўных адзінак і новых дынастый, па-за Рурыкавічамі.

Важным транслятарам ідэі персанальнай святасці становіцца ідэя прэдісіхазма і сам ісіхасцкі рух (XIII – XIV ст.) [7, с. 63, etc.], яго ўплыў асабліва адлюстроўваецца на манаскім і прыдворным жыцці, вылучаюцца асаблівасці ў шанаванні святога і, у тым ліку, скарачэнне адлегласці паміж праяўленнем цудаў і прызнаннем яго святым, уласна царкоўнай кананізацыі.

У гісторыі Вялікага Княства Літоўскага падобныя праекты ўзнікалі неаднойчы. А іх апісанне і аналіз у літаратуры несістэматызаваны і дастаткова адарваны ад агульна рэгіянальнага кантэксту ці царкоўна-канфесійнай канатацыі акта.

*Першы праект* для прадстаўніка вялікакняжаскай дынастыі і ператварэння яе ў "дынастыю святых" праводзіцца ў жыццё ў другой палове 1250-х гг. па 1263/64 г. – менавіта ў гэты прамежак часу ствараецца мадэль "князя Войшалка", якая афармляецца ў наступных катэгорыях. 1) Наратыў, які ўяўляе з сябе напісанае, верагодна адразу па смерці князя, апісанне жыцця. Яно ўтрымлівае ўказанне на месца князя Войшалка сярод дзяцей Міндоўга (дынастычнасць), праявы персанальнай духоўнай і палітычнай ахвяры (тэкст т.зв. Аповесці пра Войшалка ў Галіцка-валынскім летапісу, а таксама ў больш позніх летапісах Усходняй Еўропы). 2) Памяць пра Войшалка-манаха прасочваецца ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Прынамсі выява святога Дзмітрыя Салунскага з Лаўрашавага Евангелля трывала прыпісваецца менавіта князю Войшалку (В. Ластоўскі і інш.). 3) Лёс героя мае сваю сакральную тапаграфію – манастыры ў славянскай частцы Еўропы і чаканне падарожжа на грэцкі Афон. Апошняе цалкам укладаецца ў традыцыю паломніцтваў сярэдзіны – другой паловы XIII ст., калі ва ўмовах існавання Ліцінскай імперыі 1204–1261 гг. Святая Гара з'яўлялася мэтай паломніцкіх падарожжаў замест ахопленай крыжовымі паходамі Святой Зямлі.

Верагодна, топас "сыхода" на Афон быў для грэчаскага і славянскага праваслаўя сучасным адпаведнікам больш ранняга паломніцага шляху ў Палясціну. А прыклад святога Савы Сербскага і яго бацькі Стэфана-Семіона ператвараў паломніцтва і перасяленне на Афон жаданай "пустынню" для прадстаўніка манаршай дынастыі, элітарызаваў ідэю сыходу ад палітычных справаў.

Жыційная мадэль аповяду пра Войшалка ўтрымлівае наступныя паслядоўныя элементы: "язычніцкага стану", "пераўтварэнне ў хрысціяніна", "сыход у манашаскае жыццё", "вяртанне ў палітычны свет" (не ўцёкі з манастыра, Войшалк не манах-растрыга), а таксама можна вылучыць элементы памяці-трызны па бацьку Міндоўгу, выкананне "лёсу" ў палітычным жыцці (Войшалк бярэ на сябе ахвяру загадваць забіваць, але робіць гэта не сам а праз сваіх памагатых, былых

удзельнікаў змовы супраць манарха і бацькавых слугаў, напрыклад, нальшанскага князя Гердзеня), “сыход пасля навядзення парадка” (планы падарожжа па святым месцам пасля сустрэчы з прадстаўнікамі дынастыі князёў Данілавічаў).

Аналізу складання наратыва пра асобу князя Войшалка былі прысвечаны асобныя працы П. Талочка, А. Кібеня і інш. даследчыкаў эпохі Сярэднявечча ва Усходняй Еўропе [1; 4; 13].

У 1270-ыя – 1280-ыя гг. ні наратыў Войшалка, ні дынастыя святых Міндоўгавічаў аказаліся ў Вялікім Княстве незапатрабаванымі. Да ўлады прыходзіць Тройдзень (верагодна, не адносіўся да Літвы Міндоўга), у канцы XIII ст. улада пераходзіць да роду Віценя-Гедыміна, калі канчаткова разрываецца сувязь з папярэднім праектам.

Паралельна ў рэгіёне паўстае пскоўскі наратыў з балцкімі князямі Гердзенем і Даўмонтам. Падзея звязана і з Войшалкам, і з палітычнымі працэсамі ў Вялікім Княстве, якія вымушаюць князя-забойцу манарха Даўмонта збегчы ў Пскоў. Сканчваецца гісторыя цудавым вyратаваннем нальшанскага князя, яго службай у Пскове і пераўтварэннем у святога Цімафея і, у працяг, у бацьку першага самастойнага епіскапа Цвярскога.

Таксама ў адносінах да эпохі складаецца (праўда крыніцы дастаткова познія – XVII ст.) жыційны наратыў літоўскага князя Рынгольда-Лаўрыша сына Тройдзеня. Аднак відавочна ён дублюе ў сваіх асноўных сюжэтных кропках наратыў Войшалка [2]. Таксама як і жыціе Елісея Лаўрышаўскага (пачынае складацца ў пачатку XV ст.), асоба якога звязваецца з сынам князя Траняты [8, с. 139, etc.].

Агулам, на мяжы XIII і XIV ст. адбываецца разрыў паміж хрысціянскай сакралізацыяй роду манархаў і паганскай рэпрэзентацыяй кіруючай дынастыі Вялікага Княства. Пры апошняй мадэлі ключавым момантам з’яўляецца працэс прыняцця манархам-паганцам персанальнага хрышчэння. У адносінах да князя Гедыміна можна нават казаць пра катэхізацыю манарха. Выключна палітычны праект хрышчэння манарха быў аспрэчаны царквой (і Каталіцкай, і Праваслаўнай) у стварэнні агіяграфічнага топаса хрысціян-пакутнікаў XIV ст., якія сталі ахвярамі язычніцкай рэакцыі манархаў, адпаведна Гедыміна і Альгерда (у гістарыяграфіі аналіз праведзены Казімірам Хадыніцкім) [20; 21].

*Другім праектам*, своеасаблівым фальц-стартам, становіцца наратыў вялікага князя Альгерда. Канструяванне якога знайшло сваё адлюстраванне ў летапіснай традыцыі Усходняй Еўропы XIV–XVI ст. і паралельна ў стварэнні іконаграфічнага вобраза (легенда пра знойдзеныя А. Сапуновым іканаграфічныя партрэты Альгерда і Улляны ў Віцебску), а таксама тапанімікі (паданне пра пахаванне князя Альгерда ў кафедральным саборы ў Вільне), перапіска з канстантынопальскім патрыярхатам, дзе ўжываецца адмысловая тытулатура (апошняя праблема закраналася ў беларускай сучаснай гістарыяграфіі В. Варонiным і А. Голубевым).

Пры ўключэнні ВКЛ у заходнееўрапейскую гістарычную традыцыю ад ідэалогіі дынастыі патрабавалася падкрэсленая варварызацыя яе паходжання. Гэта дасягалася ўзорным хрышчэннем нозьбіта першай каранацыі (адпаведна Міндоўг, Ягайла, Вітаўт). Ці ўключэннем дынастыі ў больш глыбокі вядомы дынастычны варварскі наратыў (славянскі, антычны рымскі ці візантыйскі) [16; 17; 24]. І звязана з заходнееўрапейскай мадэллю канструявання ў гісторыяпісанні раннемадэрных нацый XVI ст. [5].

*Праект трэці*. Нарэшце лёс дынастыі на сумежжы ўсходнееўрапейскай і заходнееўрапейскай культур і палітычных традыцый запатрабаваў ад вялікага князя

Казіміра Ягелончыка і яго атачэння вызначыцца з актуальнай дынастыяй (што праўда і ў Кракаве, і ў Вільне быў выбраны адзін накірунак). Так нараджаецца праект "Казімір", які прапісваўся для Казіміра-бацькі, а быў рэалізаваны на Казіміры-сыну.

Пра складанне вобраза святасці караля і вялікага князя Казіміра Ягелончыка сведчыць вялікая праца праведзеная Янам Длугашам і цэлым штатам спецыялістаў па стварэнні станоўчага вобраза самой дынастыі Ягелонаў (не сумешчаны з зусім іншым вобразам ліцьвінаў). Пасля пераезду на Вавель Казімір Ягелончык пачынае фарміраваць свой вобраз святасці (верагодней пасля сярэдзіны 1450-х гг.) [19].

Гэта склалася ў палітычных і бытавых праявах двара манарха. Па-першае, вобраз Маці-жанчыны. Тут адначасова прапісваецца ўплыў на станоўчы вобраз Казіміра Ягелончыка і каралевы-маці Соф'і Гальшанскай, якая нягледзячы на статус неафіта трымала пастаянны кантакт з рымскімі пантыфікамі; і каралевы-жонкі Альжбеты Габсбург, маці каралевічаў, якая вялікую ўвагу надавала выхаванню дачок, падарожжам па святых месцах у дзяржаве. Па-другое, змена паводзін манаршага двара, дзе замест паляванняў узнікаюць мэтавыя паломніцтвы. Праводзіцца заснаванне месцаў памяці – марыйныя абразы, фундацыі для канфесій, усыпальніцы дынастыі (аднаўленне Ягайлавых капліц, стварэнне ўсыпальніцы для сябе і маці Сафіі). Казімір надае імёны сынам у традыцыі дзяржаваў, дзе плануецца што будуць кіраваць (так Аляксандр быў названы для ВКЛ у гонар Вітаўта). Па-трэцяе, дэкларaванне вядзення толькі "справядлівай" выйны: адмова ад падтрымкі татарам у вайне з маскавітамі-хрысціянамі. Нарэшце, па-чацвертае, адраджае самастойную праваслаўную мітраполію (1458 г.), але пры гэтым ўніфікуе структуру каталіцкай царквы на сваіх землях – усе біскупствы пераходзяць пад кантроль да гнезненскага архібіскупа (з 1493 г. архібіскупам становіцца сын Казіміра Фрэдырык).

Аднак у Гародне 4 сакавіка 1484 г. памірае сын Казіміра – Казімір Казіміравіч. Палітычнае жыццё маладога князя (пражыў усяго 25 год) не склалася ўдала: ён не быў выбраны каралём Венгрыі, з'яўляўся толькі намеснікам бацькі ў Польскім каралеўстве (у 1481–1482 гг.) [26, с. 197]. Адмовіўся ад шлюбу з прадстаўніцай Брандэнбургскага дому. Аднак не прымаў манашаскі пострыг і не марыў пра царкоўную кар'еру.

Пасля смерці ствараецца легенда пра рахманага палітыка, але ахвярнага хрысціяніна. Першымі біёграфамі Казіміра Казіміравіча становяцца вядомыя ў ВКЛ прапаведнікі Захарый Ферэра і Пётр Скарга [18]. Яны звяртаюць увагу на класічны канон святасці – вобраз манаха-пустынніка: 1) малітвеннік, 2) адасобіўся ад палітычнага жыцця двара, хаця быў часткай дынастыі і планаваўся на ролю кіраўніка часткі падуладных ёй тэрыторый, 3) шмат ахвяраваў на патрэбы царквы.

Вядома, што з-за хваробы не змог прыняць актыўны ўдзел у рашэннях па судовай справе аб змове Альгердавічаў-Бельскіх супраць вялікага князя Казіміра Ягелончыка ў пачатку 1480-х гг. І фактычна знаходзіўся на асаблівым становішчы ў сям'і. Адносіны бацькі, які відавочна рабіў стаўку на палітычную кар'еру сына, таксама не даканца вядомыя – таму справа доўга не рушыла да афармлення статуса святога.

Першыя просьбы пра кананізацыю Казіміра Казіміравіча пачалі гучаць з Вільні ад вялікага князя Аляксандра (і вялікакняжацкага двара, а магчыма і Гаспадарскай рады). У 1501 г. паслы Аляксандра на чале з Эразмам Цёлкам звярнуліся да папы рымскага аб распачынанні працэса прызнання святым [18]. Да справы вярнуліся пасля мяцежа Глінскага пры новым манарху Жыгімонце Старым. У 1513 г. пра святога Казіміра заступніка Літвы ў вайне з Масквой піша Андрэй

Крыцкі [18]. А ў 1516 г. біскуп віленскі Альбрэхт Радзівіл просіць папу прызнаць Казіміра святым [26, с. 191–192]. У Рыме распачынаецца працэдура прызнання, аднак у 1520 г. усё прыпыняецца. Вільня нагадвае другі раз пра Казіміра і цуды на яго труне ў 1539 г. – аднак безвынікова [26, с. 192, etc.]. Са згасаннем дынастыі Ягелонаў пры Жыгімонце Аўгусце – губляецца і цікавасць да праслаўлення святога. Адбываецца разрыў і ў ролі прадстаўніка з дынастыі ў іерархіі Каталіцкай царквы (ідзе Рэнесанс і Рэфармацыя), да таго з сыходам папы рымскага Льва X мяняюцца і падыходы да асобаў, каму і за што надаваліся годнасці святога. Казімір не быў зацверджаны.

Трэцяя спроба кананізацыі Казіміра звязана з новым біскупам віленскім Бенедыктам Войнам, які ўскрыў крыпту і нанова знайшоў мошчы, і новай дынастыяй Вазаў, якая ўзыходзіла на хвалі контррэфармацыі ў Рэчы Паспалітай і мелі свой інтарэс ва ўзнясенні дынастыі Ягелонаў да дынастыі святых. У 1602–1603 гг. працэс кананізацыі быў завершаны папскай булай і ўрачыстыя цэрымоніі ў сталіцы Вялікага Княства супалі з адыходам пошасці з Вільні ў 1603 г. Аднак афіцыйна справа аб пераходзе Казіміра ад статуса “дабраславёнага” да “святога” цягнулася да сярэдзіны 1630-х гг. [26, с. 192, etc.].

Для караля Жыгімонта Вазы і Ордэна езуітаў у Рэчы Паспалітай вельмі важна было рэалізаваць праект кананізацыі Казіміра і паказаць перавагу “дынастыі святых” над супернікамі як на праваслаўным усходзе, так і пратэстанцкай поўначы. Быў закладзены касцёл у гонар святога. Казімір становіцца патронам царквы ў Рэчы Паспалітай, складаецца народная традыцыя святак і мастацкага ўвасаблення ў іканаграфіі.

Аднак працэс афіцыйна так і не набыў палітычны характар, пераўтварыўся ў царкоўнае паданне і народнае хрысціянства. Нават пасля завяршэння будаўніцтва сабора ў імя святога Казіміра яго мошчы не былі туды перанесены. У часы Уладзіслава Вазы і Яна Казіміра, і да вайны з казакамі і пасля т.зв. Патопа рэлігійна-палітычная сітуацыя не давала магчымасці выкарыстоўваць святога Казіміра ў палітычнай прапагандзе Вазаў. Вобраз дадзенага святога ні адлюстроўваў цэнтралізацыю і ўзмацненне манаршай улады, ні з’яўляўся выратавальнікам ад палітычнага і ваеннага крызісу.

Наступныя выбарныя каралі папросту не цікавіліся лёсам несваёй дынастыі і несваіх святых. Праваднікам у распаўсюджванні культу святога Казіміра становіцца Віленскае біскупства. Аднак пераферыйнасць (немітрапалічы статус) апошняга не дазволілі культу святога з дынастыі Ягелонаў заняць сваё месца ў дзяржаўным наратыве ні ў XVII, ні ў XVIII ст.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Вілкул, Т. Галицько-Волинський літопис про пострижения литовського князя Войшелка / Т. Вілкул // Український історичний журнал. – 2007. – № 4. – С. 26–37.

2. Гудмантас, К. “Натыфікацыя пра Лаўрышаўскі манастыр, выпісаная са старой летапіснай хронікі” Дзяметрыя Занкевіча / К. Гудмантас // Гісторыя старажытнага Наваградка. Arche. Пачатак. – 2016. – №2 (147). – С. 329–349.

3. Иванов, С. А. Византийская культура и агиография / С. А. Иванов. – Москва: Изд. Дом Языки Славянской Культуры, 2020. – 536 с.

4. Кибинь, А. С. Литовский князь и индийский царевич: в поисках сходства (история о Войшелке) / А. С. Кибинь // Studia Slavica et Balcanica Petropolitana. – 2011. – № 2. – С. 11–24.

5. Любая, А.А. Антычнасць у сістэме гістарычных і ідэалагічных уяўленняў Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XV — першая палова XVI ст.) / А. А. Любая // Studia Historica Europae Orientalis. Исследования по истории Восточной Европы. – Минск: РИВШ, 2009. – Вып. 2. – С. 212–223.

6. Мартос, А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни / А. Мартос. – Минск: Изд. Белорусского экзархата, 2000. – 352 с.

7. Мейендорф, И. Рим – Константинополь – Москва. Исторические и богословские исследования / И. Мейендорф. – Москва: ПСТГУ, 2006. – 320 с.

8. Мельников, А. А. Путь непечален: исторические свидетельства о святости Белой Руси: к 1000-летию Православной Церкви на Беларуси / А. А. Мельников. – Минск: Белорусская Православная Церковь Московского Патриархата, 1992. – 241 с.

9. Пападакис, А. Христианский вопрос и возвышение папства: Церковь в 1071–1447 годах / А. Пападакис. – Москва: ПСТГУ, 2010. – 630 с.

10. Перевезенцев, С. В. Рождение русской святости / С. В. Перевезенцев // Образовательный портал Слово. – Рэжым доступа: https://www.portal-slovo.ru/history/35147.php?ELEMENT_ID=35147&SHOWALL_1=1.

11. Поппэ, А. О времени зарождения культа Бориса и Глеба / А. Поппэ// Потрал Credo.ru – Рэжым доступа: http://portal-credo.ru/site/?act=lib&id=1261.

12. Ранчин, А. М. Формирование культа святых князей Бориса и Глеба: мотивы канонизации / А. М. Ранчин // Ранчин А. М. Вертоград Златословный. Древнерусская книжность в интерпретациях, разборах и комментариях. – Москва: НЛО, 2007. – 558 с.

13. Толочко, П. Литовский князь Войшелк в русских летописях П. Толочко // Ruthenica. – 2006. – № 5. – С. 117–127.

14. Федотов, Г. П. Святые князья / Г. П. Федотов // Святые древней Руси (X–XVII ст.). – Paris: YMCA-press, 1931. – 260 с.

15. Флоря, Б.Н. У истоков раскола славянского мира (XIII в.) / Б. Н. Флоря // Исследования по истории церкви. Древнерусское и славянское средневековье. – Москва: Православная энциклопедия, 2007. – С. 125–232.

16. Фядосік, В. А. Антычнасць вачыма Сярэднявечча / В. А. Фядосік. – Мінск: БДУ, 2016. – 187 с.

17. Фядосік, В.А. Палемон Пантыйскі і легенда аб Палемоне ў летапісанні Вялікага княства Літоўскага / В. А. Фядосік // Российские и славянские исследования / Редкол.: А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск: БГУ, 2014. – Вып. 9. – С. 219–229.

18. Ярашэвіч, А. Святы Казімір у гісторыі і мастацтве / А. Ярашэвіч // Наша вера. – 2002. – № 1 (19). – Рэжым доступа: http://media.catholic.by/nv/n19/art1.htm#refs.

19. Borkowska, U. Pobożność rodziny Kazimierza Jagiellończyka / U. Borkowska // Analecta Cracoviensia. – 1984. – XVI. – S. 23–40.

20. Chodynicki, K. Geneza i rozwój legendy o 3 męczennikach wileńskich / K. Chodynicki // Ateneum Wileńskie. – 1928. – Z. 13. – S. 1–35.

21. Chodynicki, K. Legenda o męczeństwie czternastu franciszkanów w Wilnie / K. Chodynicki // Ateneum Wileńskie. – 1927. – Z. 12. – S. 1–26.

22. Gieysztor, A. Wałdza. *Symbole i rytuały* / A. Gieysztor. – Warszawa: Zamek Królewski w Warszawie, 2016. – 376 s.

23. Grzesik, R. Święty Wojciech w środkowoeuropejskiej tradycji hagiograficznej i historycznej / R. Grzesik // Studia Źródłoznawcze. – 2002. – T. XL. – S. 43–55.

24. Liubaya, A. Tradycja antyczna w systemie wyobrazeń historycznych i ideologicznych Wielkiego Ksęstwa Litewskiego (na przykładzie tradycji latopisarskiej) / A. Liubaya // Antyk, prawda i fałsz w średniowieczu: Materiały Seminariów Mediewistycznych im. Alicji

Karłowskiej-Kamzowej / Pod red. Jacka Kowalskiego i Tomasza Ratajczaka. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskiego Towarzystwa Przyjaciół Nauk, 2011. – S. 301–303.
25. Tropami świętego Wojciecha. – Poznan: Wydawnictwo Poznańskiego Towarzystwa Przyjaciół Nauk, 1999. – 412 s.
26. Wojtyska, H. D. Początki kultu i procesy kanonizacyjne św. Kazimierza / H. D. Wojtyska // Analecta Cracoviensia. – 1984. – XVI. – S. 187–229.

.

## УЧАСТИЕ РОССИИ В ПОДАВЛЕНИИ ВОССТАНИЯ ИХЭТУАНЕЙ И ЕГО ПОСЛЕДСТВИЯ ДЛЯ КИТАЙСКО-РОССИЙСКИХ ОТНОШЕНИЙ

**С. А. Лапицкий**

Минск, Белорусский государственный университет, anti-buch@yandex.by

Проникновение иностранного капитала в Китайскую империю происходило в крайне недружественной, по отношению к Китаю, форме. Российская империя, кроме экономических связей также имела политические соглашения с Китаем. Так, Россия имела соглашение о взаимной обороне с Китаем против третьих стран, и обязательство не использовать свои железные дороги для торговых целей. Несмотря на это, Российская империя активно участвует в интервенции в Китай с целью подавления восстания ихэтуаэней (боксёров), которое угрожало экономически интересам Российской империи. Разрушительная интервенция, а также оккупация и удержание Маньчжурии Россией, стали причиной полной утраты Китаем веса в международных делах. В России же, тем не менее, господствовали оптимистические настроения о нерушимости союза с Китаем.

*Ключевые слова*: Восстание ихэтуаней; Боксёрское восстание; Российская империя; Империя Цин; Маньчжурия; международные отношения; интервенция; коалиция восьми держав; китайско-российские отношения; Век унижения.

The penetration of foreign capital into the Chinese Empire took place in an extremely unfriendly form in relation to China. The Russian Empire, in addition to economic connections, also had political agreements with China. Thus, Russia had an agreement on mutual defense with China against third countries, and an obligation not to use its railways for trade purposes. Despite this, the Russian Empire is actively participates in the intervention in China with the goal of suppressing the uprising of Yihetuan's (Boxers), which threatened the economic interests of the Russian Empire. The devastating intervention, as well as the occupation and retention of Manchuria by Russia, became the reason for the complete loss of China's weight in international affairs. In Russia, however, optimistic sentiments about the inviolability of the alliance with China prevailed.

*Keywords*: Yihetuan rebellion; Boxer rebellion; Russian Empire; Qing Empire; Manchuria; international relations; intervention; Eight-Nation Alliance; Sino-Russian relations; Century of humiliation.

Восстание ихэтуаней (боксёров) имело в своём основании явные экономические и социальные основы. Проникновение иностранного капитала, безусловно, напитывало процессы модернизации и трансформации в стране, но это же разрушало устоявшийся экономический и жизненный уклад в стране. Дополнительным ударом к взрывообразному обнищанию огромного количества китайцев стала серия засушливых лет вкупе с наводнением в долине реки Хуанхэ 1898 г., которое, из-за отсутствия должного обслуживания дамб, стало ежегодным событием. На северо-востоке Китая царили голод, тиф, холера. Регион, позднее прочих столкнувшийся с иностранными державами, подвергался их экономической